■ Адкрыцці

# РЭЧАВЫЯ ПАЦВЯРДЖЭННІ «АПОВЕСЦІ МІНУЛЫХ ГАДОЎ»

## Іх знайшлі магілёўскія археолагі ў Слаўгарадскім раёне

**Студэнты МДУ імя Куляшова пад кіраўніцтвам старшага выкладчыка кафедры археалогіі і спецыяльных гістарычных дысцыплін універсітэта, магістра гістарычных навук Аляксея АЎЛАСОВІЧА працягваюць свае даследаванні ў Слаўгарадскім раёне. Але нават таго, што ім ужо ўдалося знайсці, хапае на сенсацыю.**

Дагэтуль вучоныя ніяк не маглі сысціся ў меркаванні, дзе ўсё ж такі адбылася гістарычная бітва, датаваная 984 годам, паміж войскам Уладзіміра Чырвонае Сонейка на чале з ваяводам па мянушцы Воўчы хвост і радзімічамі, апісаная летапісцам Нестарам у «Аповесці мінулых гадоў». Бо рэчка Пясчанка, якую згадвае старадаўні манах, чыста ўмоўны арыенцір. Паводле сведчання Аляксея Аўласовіча, цяпер з вялікай доляй верагоднасці можна казаць пра тое, што месца бітвы — тэрыторыя сучаснага Слаўгарадскага раёна, а не Браншчыны ці Гомельшчыны, якія таксама разглядаліся ў якасці патэнцыйных пляцовак для бітвы, бо там ёсць сугучныя па назве рэчкі.



За дзень даводзіцца перавярнуць тоны пяску.



Каштоўныя здабыткі.

— Знойдзены намі ў адным з курганных могільнікаў паясны набор княжацкага дружынніка — яскравае сведчанне на карысць «слаўгарадскага» варыянта, — кажа гісторык. — І хоць пахаваны воін далекавата ад месца легендарнай бітвы, не выключана, што ён меў да яе непасрэднае дачыненне. Астанкі дружынніка былі крэміраваныя, як таго патрабуюць паганскія традыцыі. Да гэтага можна дадаць той факт, што тры гады таму пад Слаўгарадам быў знойдзены незвычайны артэфакт — камень з выявай княжацкага трызубца. Значыць, у канцы дзясятага стагоддзя тут ужо, кажучы сучаснай мовай, існавала адміністрацыя князя Уладзіміра Чырвонае Сонейка. Яна збірала даніну з мясцовых плямёнаў радзімічаў, чые землі пасля бітвы каля ракі Пясчанкі ўвайшлі ў склад Кіеўскай Русі.

У спісе ўнікальных здабыткаў магілёўскіх археолагаў — керамічны комплекс, які датуецца X—XI стагоддзямі, срэбны дырхем з арабскай вяззю. Яшчэ ў адным кургане археолагі знайшлі два жаночыя пахаванні. На думку Аляксея Аўласовіча, яны аднаснацца прыблізна да таго ж дзясятага стагоддзя. «Калі адна жанчына была крэміраваная, то другая — пахаваная па хрысціянскім абрадзе. Час, калі яны былі адданыя зямлі, «падказаў» яшчэ і пярсцёнак адной з іх», — удакладняе ён.

Вядома, канчатковыя вывады будуць зроблены пасля падрабязнага вывучэння артэфактаў. Аднак ужо сёння можна казаць, што такія рэчы археолагі знаходзяць даволі рэдка. Ды і падняць іх праз стагоддзі з глыбінь зямлі складана. Студэнтам гісторыка-філалагічнага факультэта за дзень даводзіцца пераварочваць тоны пяску. Але гэта не палохае будучых гісторыкаў. Шмат хто з іх пасля абавязковай трохдзённай адпрацоўкі прадоўжылі раскопкі, можна казаць, на валанцёрскіх пачатках. Антон Цярэшчанка і Яўген Гарбачэўскі з іх ліку.

— Уласнымі рукамі дакрануцца да гісторыі і нават упісаць у яе сваю старонку — дзеля гэтага, пагадзіцеся, можна і трэба зрабіць усе магчымае, — выказаў думку большасці таварышаў па экспедыцыі Яўген Гарбачэўскі.

Калі вучоныя Акадэміі навук краіны пацвердзяць асноўную версію аб месцы гістарычнай бітвы княжацкай дружыны з радзімічамі каля ракі Пясчанкі, падручнік па гісторыі Беларусі дапоўняць новымі фактамі. І, як лічаць магілёўскія археолагі, адной рэдакцыяй справа не абмяжуецца. Наша зямля, як высвятляецца, захоўвае яшчэ шмат таямніц.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.** *zigulya@zviazda.by*

■

■ Надвор'е

# Цяпло вернецца з дажджамі і градам

**Пасля кароткага перапынку ў Беларусь зноў прыйдзе спёка. Пра гэта паведамляюць у Рэспубліканскім цэнтры па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды. У першай палове тыдня надвор'е на тэрыторыі краіны будзе ў асноўным вызначаць зона павышанага атмасфернага ціску, яна і прынясе высокую тэмпературу.**

Сёння, у аўторак, будзе пераважна без ападкаў. Толькі ноччу ў асобных раёнах Гомельскай вобласці пройдуць кароткачасовыя дажджы, магчымыя навальніцы. Ноччу і ранкам месцамі чакаецца слабы туман. Ноччу тэмпература паветра складзе 8—14 градусаў, удзень — 22—28 цяпла.

Заўтра ападкі таксама не прагназуюцца. Ноччу месцамі магчымы слабы туман. Тэмпература паветра ў цёмны час сутак складзе 8—15 градусаў вышэй за нуль, удзень — 23—29, у асобных раёнах Брэсцкай вобласці слупок тэрмометра пакажа +30.

Пасля гэтага ў Беларусь прыйдуць паўднёвыя вятры, і ў краіну пачнуць паступаць яшчэ больш цёплыя паветраныя масы з паўднёвых шырот, а тэмпература стане паступова павышацца. Большая частка краіны застанецца ў вобласці высокага атмасфернага ціску, а на паўночным захадзе будзе заўважны ўплыў атмасфернага фронту з Заходняй Еўропы.

У чацвер у асобных раёнах на паўночным захадзе краіны пройдуць кароткачасовыя дажджы, магчымы навальніцы. Ноччу месцамі слабы туман. У цёмны час сутак слупок тэрмометра падымецца да адзнакі 11—18 вышэй за нуль, удзень — да 24—29 градусаў. На паўднёвым захадзе ноччу чакаецца 19—20, удзень — 30—34.

Паводле папярэдніх прагнозаў, канец тыдня будзе багатым на дажджы. У пятніцу яны пройдуць пераважна на паўночным захадзе краіны, тэмпература ўначы 15—21, удзень — 26—32, па поўдні — да плюс 34. У суботу па захадзе магчымы дажджы і навальніцы, днём у асобных раёнах залевы з узмацненнем ветру парывамі да 15—20 метраў за секунду і градам. Ноччу тэрмометр будзе паказваць 15—21, удзень — 27—34, месцамі па паўночным захадзе — плюс 20—26. У нядзелю атмасферы фронт будзе рухацца ў бок усходу і прынясе дажджы з навальніцамі, моцным ветрам і градам на большую частку тэрыторыі краіны. Прагназуецца кантрасная тэмпература: уначы 13—20, удзень ад 19—21 па паўночным захадзе да 29—31 па ўсходзе.

**Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ.** *lyskavets@zviazda.by*

■

■ Занятасць

# На замежныя вакансіі

## Вырасла колькасць беларусаў, якія ездзяць на работу ў Польшчу

**Такую статыстыку прыводзіць праграма «Ла Страда». Калі ў 2013 годзе сярод абанентаў гарачай лініі па бяспечным выездзе і знаходжанні за мяжой «113» толькі восем працэнтаў выбіралі Польшчу для працаўладкавання, то летась такіх было 22 працэнты.**

Большасць жа працоўных мігрантаў традыцыйна ездзіць у Расію. Праўда, калі ў 2013-м работай у гэтай краіне цікавіліся 53 працэнты абанентаў, то ў 2016-м амаль удвая менш — 27 працэнтаў.

— Магчыма, гэта звязана з тым, што ў Расіі працягваецца крызіс і працоўных месцаў больш не становіцца, — лічыць **кіраўнік праграмы «Ла Страда» Алена НЕСЦЯРУК.** — Акрамя таго, Польшча стараецца прыцягваць спецыялістаў менавіта з блізкіх краін, стварачы спрыяльныя ўмовы.

Павелічэнне колькасці працоўных мігрантаў, што з'язджаюць у Польшчу, пацвярджае і той факт, што з мінулага года з'явіліся 32 новыя фірмы і ІП, якія маюць ліцэнзію на працаўладкаванне грамадзян за мяжой і прапануюць паслугі па пошуку работы менавіта ў Польшчы. Для параўнання: усяго ў Беларусі працуе 38 ліцэнзіятаў, якія займаюцца пасярэдніцтвам у працаўладкаванні ў польскім рэгіёне.

У цэлым у топ-5 геаграфічных пераваг патэнцыйных мігрантаў уваходзяць Польшча (12,4%), Расія (9%), Германія (8,2%), Італія (4,8%) і Турцыя (4,4%). Звяртаюцца на інфалінію і ахвотныя прыехаць у Беларусь — такіх абанентаў 13,9 працэнта.

Па ацэнках Інстытута сацыялогіі пры НАН Беларусі, цяпер работу за мяжой шукаюць каля 8—10 працэнтаў беларусаў.

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.** *lubneuskaya@zviazda.by*

■

ФАКТЫ ПАДЗЕІ НАВІНЫ

### КАЛІ ВУЧЫЦЦА, А КАЛІ АДПАЧЫВАЦЬ?

**У Міністэрстве адукацыі расказалі, як будуць адпачываць школьнікі ў 2017/2018 навучальным годзе, каб бацькі маглі загадзя спланаваць іх канікулярны час.**

Першая вучэбная чвэрць будзе доўжыцца ў беларускіх школах з 1 верасня па 28 кастрычніка. Другая — з 8 лістапада па 23 снежня. Трэцяя — з 8 студзеня па 24 сакавіка, а чацвёртая — з 2 красавіка па 31 мая.

Такім чынам, працягласць асенніх канікулаў складзе 10 дзён (з 29 кастрычніка па 7 лістапада ўключна). Зімой школьнікі будуць адпачываць 15 дзён (з 24 снежня 2017 года па 7 студзеня 2018 года) і вясной — 8 дзён (з 25 сакавіка па 1 красавіка).

Для навучэнцаў першых і другіх класаў у трэцяй вучэбнай чвэрці прадугледжаны дадатковыя зімовыя канікулы (з 12 па 18 лютага 2018 года) агульнай працягласцю 7 дзён. Летнія канікулы стартуюць для беларускіх школьнікаў 1 чэрвеня. Апошні дзень адпачынку — 31 жніўня. Такім чынам працягласць летніх канікулаў складзе 92 дні.

**Надзея НІКАЛАЕВА.** *nikalaeva@zviazda.by*

### ПЯСОК НІКУДЫ НЕ ЗНІКАЕ...

**У мастацкай галерэі «Універсітэт культуры» ў Палацы Рэспублікі заўтра пачынае сваю работу выстаўка пясочнай графікі.**

Творы, выкананыя ва ўнікальнай тэхніцы, прадстаўляюць майстры не толькі з Беларусі, але і з Расіі, Украіны, Літвы, Малдовы. Народжаны ў сярэдзіне XX стагоддзя, гэты від мастацтва спалучыў пясок і шкло. Сама ідэя графічных перамог з гледачом набыла новы і зусім нечаканы фармат. Вобразы, народжаныя рукамі мастакоў, іх фантазіяй, вывелі святло і цень на новыя вышыні ў гульні і руху колераў.

Выстаўка ў сталічнай галерэі праходзіць пры падтрымцы Аб'яднання пясочных мастакоў «Sand active». Куратар выстаўкі — вядомы беларускі пясочны графік Вольга Радзецкая. У праграме творчага праекта — майстар-класы з удзелам гледачоў, творчыя майстэрні, лекцыі, музычныя вечарыны. Мастакі збіраюцца правесці некалькі заняткаў па пясочнай анімацыі для дзяцей з абмежаванымі магчымасцямі.

**Сяргей ШЫЧКО.**

### ВАДА НЕ ДАРУЕ НЕАСЦЯРОЖНАСЦІ

**У выхадныя дні адразу некалькі здарэнняў на вадзе трапілі ў зводкі ратавальнікаў. Патанула маці дваіх дзяцей, жанчына атрымала траўмы, катаючыся на гідрацыкле, мужчына нырнуў і не вынырнуў...**

У нядзелю а 12-й гадзіне ў МНС па лініі дзяжурна-дыспетчарскай службы паступіла паведамленне пра тое, што каля вёскі Смычок Буда-Кашалёўскага раёна патанула сям'я.

Відавочцы сталі сведкамі, як на Дняпры праплывалі цэлы жанчыны і дваіх дзяцей. Кінуўшыся ў ваду, два адпачываўшыя кіроўцы і педагог дзіцячага дома выцягнулі патанулых з вады. Ім удалося адкачаць дзяўчынку і хлопчыка — пагодкаў 3 з паловай і 4 з паловай гадоў. Медыкі, якія прыбылі, канстатавалі смерць іх маці. Дзеці разам з бацькам дастаўлены ў бальніцу.

У гэты ж дзень у раённую бальніцу з траўмамі рознай ступені цяжкасці была дастаўлена жыхарка Драгічына, якая каталася на гідрацыкле. Кіруючы транспартным сродкам, яна сутыкнулася з берагам і ўпала на дрэва.

За дзень да гэтага ў Гродзенскім раёне мужчына пайшоў купацца ў вадаёме каля вёскі Караліно. Дарэчы, на купанне ў гэтым месцы дзейнічае забарона. Нырнуўшы ў ваду, больш на паверхні вады ён не з'явіўся.

### ШУМ У КВАТЭРЫ І РАБАВАННЕ БАНКА

Ад самоты пажылыя людзі бяруць у руку тэлефонную трубку і...

**У дзяжурную частку Цэнтральнага РУУС сталіцы паступіла паведамленне з банка аб тым, што ў кантакт-цэнтр звярнулася жанчына і расказала, нібыта клііента банка плануе злачынства.**

— Была ўстаноўлена асоба, якая тэлефанавала, — ёю аказалася пажылая жанчына 1933 года нараджэння. У гутарцы з міліцыянерамі яна прызналася, што пасля смерці мужа адчувае сябе вельмі самотна, а такія званкі дазваляюць ёй мець стасункі з людзьмі, — расказала **афіцыйны прадстаўнік Цэнтральнага РУУС г. Мінска Таццяна АБОЗНАЯ.**

Праз некалькі гадзін у дзяжурную частку паступіла паведамленне ад 82-гадовай пенсіянеркі, якая паскардзілася на старонніх шумы ў яе кватэры, выказаўшы здагадку, што ёй перашкаджаюць адпачываць суседзі. На месцы было ўстаноўлена — у жыллі старонніх шумоў няма, а ў ходзе гутаркі жанчына расказала, нібыта апошнім часам яна стала часта чуць старонніх гукі. Жыве пенсіянерка адна, ёсць дзеці, унукі, але яны яе не наведваюць...

### БТР СУТЫКНУЎСЯ З МІКРААЎТОБУСАМ

**Такое здарэнне адбылося ва Украіне з удзелам мікрааўтобуса з нашай краіны ў нядзелю.**

У Ровенскай вобласці побач з ваенным палігонам не размінуліся бронетранспарцёр, які пераязджаў дарогу, і мікрааўтобус «Фольксваген». Тры чалавекі, якія былі ў салоне апошняга, атрымалі траўмы, ім была аказана медыцынская дапамога. Ваенныя і кіроўца мікрааўтобуса не пацярпелі.

**Сяргей РАСОЛЬКА.** *rs@zviazda.by*